Ігар ГУШЧЫНСК

# ЭКСДЫВІЗАРСКІЯ СУДЫ на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII ст. — 1840 г.)

*Пасля далучэння тэрыторыі Беларусі да Расійскай Імперыі ў канцы XVIII ст. тут былі захаваныя мясцовыя нормы грамадзянскага судаводства, што грунтаваліся на нормах Статута ВКЛ 1588 г. і пастановах сойма Рэчы Паспалітай. Адной са спецыфічных рыс, якія адрознівалі грамадзянскі судовы працэс гэтай дзяржавы ад расійскага, была форма спагнання даўгоў пэўнай асобы на карысць некалькіх крэдытораў. Паводле расійскіх законаў, маёмасць даўжніка павінна была прадавацца па рашэнні суда, а выручаныя сродкі — дзяліцца паміж крэдыторамі. Згодна ж з прававой традыцыяй ВКЛ і Рэчы Паспалітай дзялілася сама нерухомасць даўжніка — будынкі, землі і інш. Для гэтага ствараліся так званыя эксдывізарскія (эксдывізарска-таксатарскія, таксатарска-эксдывізарскія) суды. Яны мусілі праводзіць ацэнку маёмасці даўжніка (таксацыю), а затым яе падзел паміж пазыкадаўцамі (эксдывізію).*

Цікавасць да вывучэння эксдывізарскага права ўзнікла яшчэ ў XIX ст. Найперш гэта было звязана са спробамі ўпарадкаваць прававую сістэму тэрыторый, далучаных да Расійскай Імперыі падчас падзелаў Рэчы Паспалітай. На гэтых землях дзейнічалі мясцовыя прававыя нормы, але яны не былі сістэматызаваныя. У выніку паўстала вострая неабходнасць стварыць пэўны заканадаўчы звод. У дадзеным кантэксце варта адзначыць дзейнасць II аддзялення імператарскай канцылярыі па падрыхтоўцы зводу мясцовых законаў так званых заходніх губерняў. У падрыхтаваным у 1830-я гг. праекце былі сістэматызаваныя дзеючыя ў краі прававыя нормы і традыцыі, у тым ліку тыя, што датычыліся эксдывізарскіх судоў[1]. Хаця дадзены праект так і не набыў юрыдычнай сілы, ён з'яўляецца каштоўнай крыніцай для вывучэння судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі канца XVIII — першай трэці XIX ст. Тое ж самае можна сказаць і пра выдадзеную ў 1826 г. працу А.Каравіцкага "Літоўскі грамадзянскі працэс" ("Proces cywilny litewski")[2], якая мела практычнае значэнне і выкарыстоўвалася ў якасц зборніка дзеючых заканадаўчых норм.

Тэма эксдывізарскіх судоў была надзвычай актуальнай для сучаснікаў і знайшла адлюстраван не ў тагачаснай публіцыстыцы, мастацкіх творах, а таксама мемуарах. Так, па гэтай праблеме ў 1816—1817 гг. была спецыяльна надрукаваная цэлая серыя артыкулаў у часопісе "Віленскі дзённік" ("Dziennik Wileński")[3]. Дзве гісторыка-прававыя працы, прысвечаныя эксдывізарскім судам, былі выдадзеныя ў канцы XIX ст. — "Эксдивизорские суды и их компетенция в губерниях бывшего Великого княжества Литовского в конце XVIII и первой половине XIX в." Я.М.Вайшвілы[4] і "Виленский эксди



**ГУШЧЫНСКІ Ігар Генадзьевіч.**

*Намеснік дэкана па вучэбнай рабоце факультэта дашкольнай адукацыі Беларускаг дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат гістарычных наву дацэнт. Нарадзіўся ў 1984 г. на ст. Навасады Барысаўскага раёна Мінскай вобласц У 2006 г. закончыў гістарычны факультэт БДПУ па спецыяльнасці "гісторыя, сацыяльна палітычныя дысцыпліны". У 2011 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю "Роля судовы установ у палітычным жыцці і сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі (1864—1914 гг.) (навуковы кіраўнік — прафесар А.П.Жытко). З 2010 г. выкладае ў БДПУ. Даследуе гісторы судовых органаў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII — пачатку XX ст. Аўтар каля 50 навуковы публікацый.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

...візорский дом (историко-юридическая справка)" С.Ф.Рубінштэйна[5]. Аднак пазней гэтая праблема закраналася гісторыкамі і правазнаўцамі толькі ў кантэксце вывучэння сумежных альбо больш шырокіх тэм: судовай сістэмы краю ў канцы XVIII — першай палове XIX ст.[6], Статута ВКЛ 1588 г.[7], гісторыі эканамічнага права[8], у цэлым гісторыі дзяржавы і права Беларусі[9]. Прычым у большасці прац у якасці крыніц інфармацыі аб эксдывізарскіх судах выкарыстаны выключна згаданыя вышэй публікацыі Я.Вайшвілы і С.Рубінштэйна.

Характэрнай і адной з найважнейшых з'яў эканамічнага жыцця на тэрыторыі Беларусі ў разглядаемы перыяд стала абцяжарванне памешчыцкіх гаспадарак даўгамі, і ў выніку — іх падзел паміж крэдыторамі. Яскравым індыкатарам эканамічнага крызісу, перш за ўсё ў сферы сельскай гаспадаркі, стаў рэзкі рост у пачатку XIX ст. колькасці эксдывізарскіх судовых спраў аб падзеле маёнткаў за даўгі. У публіцыстычных і літаратурных творах сучаснікаў эксдывізарскія суды і эксдывізіі нярэдка выступалі ў якасці своеасаблівага сімвала разлажэння традыцыйных гаспадарчых практык беларуска-літоўскай маянтковай шляхты, яе саслоўных стэрэатыпаў, эканамічнай, прававой і побытавай культуры. У сувязі з гэтым праблема гісторыі эксдывізаркіх судоў у канцы XVIII — першай палове XIX ст. бачыцца нам актуальнай. Раскрыццё прававых асноў эксдывізій, абагульненне судовай практыкі, выяўленне месца і ролі гэтых судоў у рэгуляванні эканамічных адносін у краі дазваляюць паглыбіць навуковыя веды аб дадзеным перыядзе ў гісторыі Беларусі, змогуць паспрыяць актуалізацыі гістарычнага вопыту (вырашэння спрэчак маёмасна-фінансавага характару).

### Узнікненне і заканадаўчае забеспячэнне эксдывізарскіх судоў

Тэрмін "эксдывізія" паходзіць ад лацінскіх слоў "ex" ("з") і "divisio" ("дзяленне", "падзел"). У Статутах ВКЛ ён не сустракаецца, як не прадугледжаны ў іх увогуле падзел маёмасці даўжніка, калі крэдытораў было некалькі[10]. Артыкул 11 раздзела 7 Статута ВКЛ 1588 г. вызначаў іншыя спосабы спагнання доўгу на карысць некалькіх пазыкадаўцаў. Яны залежалі ад таго, пакрываў кошт маёмасці даўжніка суму запазычанасці ці не. У першым выпадку яго маёнтак альбо перадаваўся ва ўладанне аднаму з крэдытораў (з умовай, што той сплаціць астатнім іх долі), альбо запрадаваўся старонняму чалавеку з размеркаваннем атрыманай сумы паміж давернікамі прапарцыянальна сумам іх пацверджаных прэтэнзій. Калі ж для пакрыцця даўгоў усіх крэдытораў кошту маёнтка не хапала, ён пераходзіў ва ўладанне толькі аднаму з іх — па першынству даўгавога запісу[11]. Аднак прыкладна з сярэдзіны XVII ст. стала ўкараняцца практыка эксдывізіі — падзелу маёмасці даўжніка паміж усімі пазыкадаўцамі прапарцыянальна іх долям у агульнай суме доўгу. Для гэтага па рашэнні суда (Трыбунала ВКЛ, земскага ці гродскага судоў), альбо ў некаторых выпадках манарха, для кожнай канкрэтнай справы ствараліся адмысловыя суды. За імі з цягам часу замацаваліся назвы эксдывізарскіх, таксатарска-эксдывізарскіх, эксдывізарска-таксатарскіх, падкаморска-эксдывізарскіх, а таксама дзельчых і дзельчых конкурсных. У асноўным яны ствараліся для падзелу маёмасці, якая знаходзілася ў сельскай мясцовасці. Што датычыць гарадской нерухомасці даўжніка, то, паводле канстытуцыі 1764 г., яна падлягала продажу з таргоў, а не падзелу[12]. Аднак на практыцы мелі месца выпадкі, калі гарадскія суды (магістраты) пастанаўлялі спаганяць даўгі з даўжніка праз эксдывізію яго гарадской маёмасці[13]. Так, у 1817 г. у Мінску эксдывізарскі суд падзяліў дом Антона Марсэнта (на рагу вуліц Койданаўскай і Філіцыянскай)[14].


PROCES CYWILNY
LITEWSKI
STARANIEM I PRACĄ
ALEXANDRA KOROWICKIEGO
MAGISTRA OBOYGA PRAW.
WILNO.
JÓZEF ZAWADZKI WŁASNYM NAKŁADEM.
1826.

Вокладка кнігі А.Каравіцкага "Літоўскі грамадзянскі працэс".

Дакладную дату ўзнікнення эксдывізарскага правасуддзя вызначыць цяжка. Шэраг меркаванняў на гэты конт быў выказаны ў першай палове XIX ст. Прэзідэнт II дэпартамента Мінскага галоўнага суда Ян Ходзька пісаў, што першай эксдывізіяй быў падзел у 1686 г. па загадзе манарха маёмасці памерлага гетмана ВКЛ Януша Кішкі[15]. Ігнацы Казіміравіч Дамейка (дзядзька сусветна вядомага навукоўца Ігнацыя Іпалітавіча Дамейкі), які быў адвакатам і рэгентам (сакратаром) Трыбунала ВКЛ, слонімскім павятовым маршалкам, прыводзіў больш ранні прыклад эксдывізіі — падзел паводле рашэння Трыбунала ВКЛ ад 1664 г. маёнткаў Палонка (у Навагрудскім павеце) і Круговічы (у Слуцкім павеце), што належалі навагрудскаму кашталяну Міхалу Рудаміне[16]. Гісторык Міхал Балінскі першай эксдывізіяй называў падзел паміж крэдыторамі маёнтка Сапегаў Гальшаны[17]. У любым выпадку эксдывізарскі суд як юрыдычны інстытут не быў уведзены пэўным заканадаўчым актам, а ўзнік і функцыянаваў у форме прававога звычаю.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ



*Ян Ходзька.*

Толькі ў соймавай канстытуцыі 1726 г. дзейнасць эксдывізарскіх судоў атрымала пэўную заканадаўчую рэгламентацыю. Ёю прадугледжвалася ацэнка судом кошту маёнтка даўжніка на падставе вызначэння якасці зямлі (раллі, лугоў, лясоў), а таксама ўсіх даходаў. Для падзелу маёмасці паміж пазыкадаўцамі прадпісвалася прыцягненне каморнікаў (землямераў), выдаткі на якіх ускладаліся на суцяжнікаў. Таксама агаворвалася, што, у выпадку калі маёнткі даўжніка размяшчаліся ў розных паветах, з просьбай аб яе падзеле належыць звяртацца ў Трыбунал ВКЛ (у 1797—1840 гг. гэтай інстанцыі адпавядалі галоўныя суды, што знаходзіліся ў губернскіх гарадах)[18]. У канстытуцыі 1766 г. прапісвалася магчымасць фарміраваць склад суддзяў для правядзення эксдывізіі па ўзаемнай згодзе самім суцяжнікам (па трое з боку даўжніка і крэдытораў). Калі кандыдатуры адхіляліся супрацьлеглым бокам, суддзі прызначаліся судом[19]. Пры стварэнні эксдывізарскіх судоў і ў іх непасрэднай дзейнасці прымяняліся і іншыя соймавыя канстытуцыі, а таксама Статут ВКЛ 1588 г. У іх не згадвалася пра эксдывізіі, але рэгламентаваліся многія аспекты вырашэння маёмасных спрэчак. Напрыклад, меліся ўказанні адносна класіфікацыі даўгоў на першачарговыя і астатнія[20], падсуднасці іскаў аб спагнанні пазык[21], тэрмінаў даўнасці прэтэнзій крэдытораў, магчымасці выкупу даўжніком забранай у яго маёмасці ў наступным[22], няяўкі кагосьці з зацікаўленых бакоў на судовае пасяджэнне[23]. Пазней, у першай трэці XIX ст., расійскімі ўладамі былі прынятыя меры па ўдакладненні і ўпарадкаванні некаторых аспектаў дзейнасці эксдывізарскіх судоў у заходніх губернях. Былі выдадзеныя законы, якія датычылі тэрміну іскавай даўніны, абкладання рашэнняў эксдывізарскіх судоў пошлінай[24], выдзялення яўрэям па эксдывізіях зямельных надзелаў з сялянамі (якімі яны не мелі права валодаць)[25], падзелу так званых паезуіцкіх маёнткаў (частка іх даходаў прызначалася для ўтрымання навучальных устаноў)[26], і некаторыя інш. Аднак заканадаўча рэгламентаванымі заставаліся далёка не ўсе аспекты дзейнасці эксдывізарскіх судоў. Цэльнага заканапалажэння аб эксдывізіях не існавала. Эксдывізарскі судовы працэс вызначаўся галоўным чынам не пісаным правам, а традыцыяй, што склалася на практыцы. Адпаведна, судовыя працэсы ў сваіх дэталях маглі значна адрознівацца адзін ад аднаго. Гэта, натуральна, уяўляе складанасць для гісторыка-прававога даследавання дадзенай праблемы ў плане абагульнення прававой базы і практыкі дзейнасці эксдывізарскіх судоў. Таму не дзіўна, што звесткі аб дзейнасці эксдывізарскіх судоў, што ўтрымліваюцца ў публіцыстычных, прававых і гісторыка-прававых працах, прысвечаных дадзенай праблеме, часта супярэчаць адны іншым.

## Эксдывізарскі судовы працэс

Ініцыятарамі эксдывізарскіх судоў часта выступалі самі даўжнікі, якія жадалі нарэшце выблытацца з даўгоў. Калі іх маёмасць знаходзілася ў межах аднаго павета, для гэтага ім трэба было звярнуцца з адпаведнай просьбай у земскі павятовы суд. А калі ў розных — у галоўны суд. Часцей за ўсё на падзел даўгавога маёнтка пагаджаліся ўсе зацікаўленыя бакі[27]. Эксдывізіі маглі распачынацца і ў выніку звароту кагосьці з крэдытораў у суд з просьбай спагнаць нявыплачаны доўг. Калі прэтэнзіі судом пацвярджаліся, адбывалася ацэнка даходаў маёнтка (маёнткаў, калі іх было некалькі) даўжніка, а затым перадача (традзіраванне[28]) нерухомасці крэдытору ў валоданне да пакрыцця доўгу. У выпадку, калі ўся нерухомасць даўжніка ўжо была традзіравана іншым асобам, чыноўнік, які праводзіў ацэнку маёмасці, выдаваў крэдытору адпаведную даведку. І ўжо з ёй можна было звярнуцца ў суд з хадайніцтвам аб прызначэнні эксдывізарскага суда для адначасовага разбору справы з удзелам усіх крэдытораў[29]. Пасля гэтага рашэннем адпаведнага суда абвяшчалася эксдывізія маёнтка даўжніка. Для разбору справы стваралася спецыяльная часовая судовая прысутнасць — эксдывізарскі суд: фарміраваўся яго склад, вызначаліся тэрмін і месца першага пасяджэння. Суд, які прымаў рашэнне аб эксдывізіі, таксама мог адразу прапісаць у сваім рашэнні такія аспекты, як памер аплаты працы членаў эксдывізарскага суда, перадача маёнтка камусьці ў кіраванне на перыяд судовага разбору, правілы класіфікацыі даўгоў для вызначэння парадку іх пагашэння і інш. Пры прызначэнні эксдывізіі даўжнік мог запатрабаваць прызначыць яму пэўную суму (за кошт даходаў маёнтка, які падлягаў падзелу) для ўтрымання яго і сям'і ў перыяд судовага разбору. У некаторых выпадках даўжнік прасіў прызначыць яму адваката (таксама за кошт даходаў маёнтка)[30].

У склад эксдывізарскага суда ўваходзілі ўласна суддзі (эксдывізары), а таксама сакратары для вядзення запісаў (рэгенты) і землямеры (каморнікі). І

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

канадаўча ніяк не рэгламентаваліся, што вяло да замаруджвання разбору спраў на доўгі час. Мяркуючы па некаторых звестках успамінаў ці мастацкіх твораў, выпадкі зацягвання эксдывізарскіх працэсаў на гады былі звычайнай з'явай. Прычым увесь гэты час члены суда маглі заставацца ў адпаведным маёнтку і ўтрымлівацца за яго кошт[49].

Прысутнасць крэдытора на заключнай сесіі эксдывізарскага суда была абавязковай. У адваротным выпадку яго прэтэнзіі лічыліся пагашанымі. На другім з'ездзе суда спачатку заслухоўваліся зацікаўленыя бакі і разглядаліся іх доказы[50]. Прынятыя да выканання прэтэнзіі крэдытораў суд ранжыраваў на тыя, што павінны задавальняцца ў першую чаргу і далей. Пры гэтым дзейнічалі пэўныя правілы. Казённыя даўгі задавальняліся раней, чым прыватныя. Прэтэнзіі малалетніх да іх былога апекуна задавальняліся раней за астатнія. Даўгі спадчынныя мелі прыярытэт перад асабістымі. Пазыкі пад залог маёмасці мелі перавагу перад даўгавымі распіскамі. З двух аднолькавых па значэнні дакументаў мацнейшымі лічыліся больш раннія па часе рэгістрацыі. Існавалі і іншыя правілы. Затым праводзілася т. зв. таксацыя — ацэнка кошту нерухомасці і вызначэнне даходаў маёнтка. Эксдывізары асабіста аглядалі будынкі, угоддзі, а таксама кнігі, рахункі, кантракты. Яны маглі запытваць інфармацыю аб маёнтку ў таго, хто непасрэдна ім кіраваў на той момант ("адміністратара"). Пасля гэтага адбываўся падзел маёмасці на часткі з вызначэннем кошту кожнай. А ўжо затым — размеркаванне іх паміж крэдыторамі. Землямеры адразу павінны былі зрабіць для кожнага крэдытора план выдзеленай яму часткі маёнтка[51]. Пасля завяршэння эксдывізарскага суда матэрыялы справы перадаваліся ў тую судовую ўстанову, якая прызначыла эксдывізію[52].

Пэўную інфармацыю аб ходзе эксдывізарскіх судовых працэсаў утрымлівае шэраг твораў мастацкай літаратуры, напісаных пісьменнікамі-сучаснікамі: аповесці "Апошняя сесія эксдывізіі" ("Ostatnia sessya exdywizyi") І.Ходзькі[53], "Пляменніца і цётка" ("Siestrzenica i ciotka") Е.Фялінскай[54], "Аповесць з майго часу, альбо Літоўскія прыгоды" ("Powieść z czasu mojego, czyli Przygody Litewskie") І.Яцкоўскага[55], а таксама раман Ф.Булгарына "Иван Выжигин"[56]. Зразумела, літаратары апісвалі прыватныя выпадкі і, натуральна, не ставілі мэтай дакладна адлюстраваць правілы і нормы судаводства. Аднак яны паказалі некаторыя падрабязнасці ходу пасяджэнняў эксдывізарскіх судоў, іх атмасферу, што практычна немагчыма ўзнавіць па заканадаўчых актах і матэрыялах судовага справаводства. Перш за ўсё тут трэба адзначыць аповесць Ігнацыя Ходзькі (пляменніка згаданага вышэй прэзідэнта грамадзянскага дэпартамента Мінскага галоўнага суда Яна Ходзькі) "Апошняя сесія эксдывізіі" з цыкла "Літоўскія карціны" ("Obrazy litewskie").

Увесь сюжэт дадзенага твора непасрэдна разгортваецца падчас другога з'езда эксдывізарскага суда. У абагульненым выглядзе апісанае І.Ходзькам судовае пасяджэнне выглядала наступным чынам. Каля дома ўладальніка маёнтка (даўжніка) пасвіліся 10—20 распрэжаных коней рознай масці, стаяла каля дзясятка павозак, побач з імі некалькі дзясяткаў асоб (рознага ўзросту і па-рознаму апранутых) жыва вялі размовы. У самім доме для пасяджэнняў суда быў выбраны адзін з найлепш абсталяваных пакояў. Пасярод яго стаяў доўгі стол. На стале — круцыфікс (крыж з распяццем *"як абаронца сумлення суддзяў"*, судзейскі званок, а таксама знак прэзідэнцкай улады (прэзідэнтам называлі старшыню суда). Вакол стала стаялі тры крэслы. На адным з іх сядзеў у чаканні прыбыцця суда возны (асоба, якая на судовым пасяджэнні выконвала функцыі судовага прыстава). У памяшканні панавалі тлум і мітусня, дзверы пакоя то адчыняліся, то зачыняліся. У адным месцы хтосьці раскладаў нейкія паперы. У іншым — больш дзясятка асоб, трымаючы ў руках мапу, вадзілі па ёй пальцамі і паказвалі нешта адзін аднаму. Нехта з зацікаўленых асоб паводзіў сябе больш актыўна — бегаў ад адных да другіх, аб нечым размаўляў, прычым на голас ціха, але са жвавай мімікай і выразнымі жэстамі. Раз-пораз чуліся гучныя рэплікі перамоўцаў: *"Сто! І ні гроша болей!", "На сухія бары і лясы. Не дачакаешся!", "Згода!"* і інш., — якія азначалі ўпрачныя спрэчкі, альбо наадварот — дасягнутыя дамовы[57]. Неўзабаве ўвайшлі суддзі. За імі — у выцертым кафтане, з вялікай кнігай пад пахай і пяром за вухам судовы рэгент, які акідваў усіх праніклівым позіркам. На ківок прэзідэнта адазваўся ўрачыстым галасам возны: *"Суд таксатарска-эксдывізарскі выклікае!"* Далей мовіў прэзідэнт, які папярэдзіў суцяжнікаў, што яны маюць магчымасць прад'явіць суду свае аргументы па справе, бо гэта апошняе яго пасяджэнне. Пасля гэтага прысутныя прыйшлі ў нейкі рух, у памяшканні зноў узняўся тлум. Тым часам суддзі занялі свае месцы. Затым з прамовамі выступілі галоўныя адвакаты: адзін — з боку ўсіх крэдытораў, другі — даўжніка[58]. Па заканчэнні выступленняў адвакатаў прэзідэнт зазваніў у званок, а возны прамовіў: *"Да намовы!"* Гэта азначала неабходнасць суцяжнікам і "гледачам" пакінуць памяшканне, у якім заставаліся толькі члены суда для абмеркавання і падрыхтоўкі рашэння. Натоўп пакідаў пакой, а возны з трэскам зачыняў дзверы, *"пакідаючы за імі лёс даўжніка, справядлівасць суддзяў і надзеі крэдытораў"*[59].

Вердыкт эксдывізарскага суда мог насіць як часовы, так і канчатковы ("вечны") характар. Калі пасля задавальнення прэтэнзій крэдытораў у даўжніка заставаліся яшчэ іншыя крыніцы даходаў, з якіх можна было ў перспектыве расплаціцца, ён меў права на працягу 10 гадоў поўнасцю ці часткова выкупіць падзеленую маёмасць[60]. Калі ж у выніку эксдывізіі прэтэнзіі крэдытораў аказваліся пакрытымі не ў поўным аб'ёме, пераход правоў уласнасці лічыўся канчатковым. Больш за тое, пазыкадаўцы атрымлівалі права спаганяць доўг з даўжніка за кошт маёмасці, якая ў яго з'явіцца ў наступным. Пры гэтым тэрмін даўнасці не ўсталёўваўся[61]. Артыкул 98 раздзела 4 Статута ВКЛ 1588 г. у выпадку няздольнасці даўжніка распла

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



*Прыклады геаметрычных планаў частак падзеленых эксдывізарскім судом маёнткаў.*

[illegible], у тым ліку за кошт сваёй маёмасці, прадугледжваў яго арышт судом і нават зняволенне крэдыторамі[62]. Аднак на практыцы дадзеная норма яшчэ з [illegible] часоў не выкарыстоўвалася.

Рашэнне эксдывізарскага суда прыводзілася ў выкананне адразу. Прычым незалежна ад таго, пажадаў хосьці з зацікаўленых бакоў апеляцыю ці не. Пры гэтым дапускалася падача апеляцыі ў галоўны суд. Калі яна задавальнялася, прызначалася праверка падзелу маёнтка. З гэтай мэтай з чыноўнікаў галоўнага суда ўтваралася часовая судовая прысутнасць, якая правярала абскарджаныя дзеянні эксдывізарскга суда. Рашэнне суда другой інстанцыі можна было абскардзіць у Сенаце. Яго пастанова лічылася канчатковай, хаця ў некаторых выпадках справы перадаваліся на далейшы разгляд у Дзяржаўны савет[63]. Па звестках С.Рубінштэйна, рэдкае рашэнне эксдывізарскага суда пасля разгляду справы апеляцыйнай інстанцыяй заставалася без унясення змен. У выніку ўзнікалі новыя бясконцыя і складаныя цяжбы, якімі былі заваленыя суды[64]. Новыя спрэчкі ў некаторых выпадках правакавала няякасная праца эксдывізарскіх судоў. Напрыклад, былі распаўсюджаныя выпадкі, калі каморнікі не выканалі працу па размежаванні ўчасткаў[65]. Так, у 1819 г. па рашэнні эксдывізарскага суда крэдыторы былога мінскага губернатара Казіміра Сулістроўскага атрымалі часткі яго ўладанняў. Аднак суд ім не выдаў адпаведныя геаметрычныя планы, і ўвогуле многія ўчасткі засталіся неразмежаванымі. Гэта стала прычынай шматлікіх судовых спрэчак аб межах, якія расцягнуліся на доўгія гады[66].

Як бачым, у першай трэці XIX ст. расійскі урад не ўнёс значных змен у правілы дзейнасці эксдывізарскіх судоў, як і ўвогуле ў сферу грамадзянскага судаводства краю. Аднак у дачыненні пошлін і збораў з судовых працэдур улады прынялі меры па ўкараненні агульнаімперскіх парадкаў. У канцы XVIII ст. на заходнія губерні былі распаўсюджаны расійскія заканадаўчыя нормы аб пошлінах з маёмасных здзелак[67]. Фактычна гэта датычыла і атрымання маёмасці па рашэннях эксдывізарскіх судоў. Аднак на практыцы нявыплата пошлін на карысць казны тут была масавай з'явай. Такая сітуацыя мела месца не толькі па эксдывізарскіх справах, але і іншых аперацыях з нерухомасцю. Аб гэтым у 1806 г. віленскі губернскі пракурор паведамляў міністру юстыцыі Пятру Лапухіну[68]. Указ Сената ад 16 мая 1807 г. канкрэтызаваў, што пасля атрымання маёмасці па прашэнні эксдывізарскага суда крэдыторы павінны былі выплачваць у казну пошліну памерам у 4 % ад яе кошту[69]. Аднак і пасля гэтага пошліны не плаціліся. Сенацкі ўказ ад 10 чэрвеня 1810 г. забараняў прывядзенне ў выкананне любых здзелак, звязаных з пераходам правоў уладання нерухомасцю, да выплаты пошлін. Але і ў далейшым гэта не выконвалася, прынамсі да 1822 г., калі яшчэ адзін указ Сената прадпісаў губернскім адміністрацыйным уладам і грамадзянскім дэпартаментам галоўных судоў заходніх губерняў не дапускаць крэдытораў да кіравання падзеленай па эксдывізіі маёмасці да выплаты пошлін[70].

Да разнавіднасці эксдывізарскіх судоў можна аднесці дзейнасць спецыяльных камісій па справах аб пагашэнні даўгоў некаторых буйных землеўласнікаў. Так, у 1814 г. па ўказе расійскага імператара Аляксандра I такая камісія была створана для разбору даўгоў Дамініка Радзівіла[71].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Эксдывізарскія суды ў эканамічным жыцці і грамадскіх дыскусіях

Да пачатку XIX ст. эксдывізарскія суды былі дастаткова рэдкімі. Аднак затым іх колькасць стала ўзрастаць. А ў другім дзесяцігоддзі XIX ст. гэтая з'ява стала масавай. Так, калі ў 1797 г. у газеце "Віленскі веснік" былі надрукаваныя абвесткі толькі аб дзвюх эксдывізіях (інфармаванне аб гэтым усіх зацікаўленых бакоў праз мясцовую газету было абавязковым), то ў 1800 г. — аб сямі, 1804 г. — аб васьмі, 1811 г. — ужо аб 53-х. Да канца 1830-х гг. іх колькасць была значнай (не менш за некалькі дзясяткаў у год). Пісьменнік Станіслаў Мараўскі ў сваіх успамінах пісаў аб своеасаблівым *"духу літоўскім эксдывізійным"*, які пранізаў жыццё краю[72]. Натуральна, маштабы росту колькасці эксдывізій і дзейнасць эксдывізарскіх судоў прыцягвалі ўвагу сучаснікаў. Напрыклад, грамадскі дзеяч і былы суддзя Віленскага галоўнага суда Уладзімір Гадон у 1816 г. называў эксдывізіі *"заразай"*, аб прадухіленні і выкараненні якой *"павінен думаць кожны грамадзянін"*[73]. А вядомы палітычны і грамадскі дзеяч таго часу Ксаверый Друцкі-Любецкі характарызаваў іх як *"адно з егіпецкіх бедстваў, якое робіць падкоп пад будынак гаспадарчага быту роднай Літвы"*[74]. Вялізная колькасць эксдывізій шляхецкіх маёнткаў прыцягнула ўвагу і цэнтральных уладаў. У сакавіку 1816 г. Сенат прадпісаў грамадзянскім дэпартаментам галоўных судоў даць тлумачэнні па розных аспектах дадзенай праблемы: на якіх законах грунтаваліся эксдывізарскія суды, якія прававыя механізмы тут замянялі іпатэку, у чым прычыны павелічэння колькасці эксдывізій і г. д. Сенат патрабаваў прадставіць прапановы па магчымых мерах выпраўлення сітуацыі. Адпаведныя матэрыялы прэзідэнта II (грамадзянскага) дэпартамента Мінскага галоўнага суда Яна Ходзькі былі апублікаваныя ў часопісу "Віленскі дзённік"[75]. Пазней з'явілася цэлая серыя артыкулаў па дадзенай тэме. Прадметам дыскусій у іх былі, па-першае, прыведзеныя вышэй пытанні Сената, а таксама ўвогуле праблема недасканаласці заканадаўства ў краі.

У прыватнасці, былі выказаны меркаванні адносна прычын росту колькасці эксдывізарскіх судоў. Відавочна, само па сабе гэта было следствам абцяжарвання памешчыцкіх гаспадарак даўгамі, у выніку чаго і адбываўся іх падзел паміж крэдыторамі. А прычыны такой сітуацыі сучаснікі бачылі галоўным чынам у крызісе сельскай гаспадаркі і марнатраўстве шляхты[76]. Так, Я.Ходзька апісваў наступную з'яву. У самым пачатку XIX ст. ва ўмовах вельмі добрай кан'юнктуры для сельскагаспадарчай вытворчасці (высокія попыт і кошты на прадукцыю) рэзка выраслі даходы землеўласнікаў. Гэтаму таксама спрыяў рост гандлю лесам. Аднак вялікія прыбыткі правакавалі ў значнай часткі шляхты, з аднаго боку, імкненне набыць яшчэ больш зямельнай уласнасці, а з іншага — схільнасць да раскошы. У такой сітуацыі пашырылася практыка ўзяцця крэдытаў, бо
ў шляхецкай свядомасці ўкаранілася ўяўленне, ш
вялікія прыбыткі з маёнткаў дазволяць праз некал
кі год вярнуць пазыкі. Але неўзабаве кошты на збо
жа знізіліся, а ў 1812 г. моцны ўдар па гаспадарках н
несла вайна. У выніку даўжнікі не маглі расплаціцца
крэдыторамі. У такіх абставінах яны спяшаліся пра
эксдывізію пагасіць свае пазыкі, каб захаваць хаця
частку уладанняў, бо з-за працэнтаў іх даўгі штогс
толькі раслі[77]. Згаданы вышэй У.Гадон звяртаў ува
на недасканаласць дзеючага ў краі залогавага прав
што грунтавалася на нормах Статута ВКЛ 1588 г. П
яго словах, пры заключэнні здзелак як давернікі, та
і даўжнікі, мусілі дзейнічаць нібыта з завязанымі ва
чыма. Першыя не ведалі кошту маёмасці, якой даўж
нік мог гарантаваць зварот пазыкі. Другія — да якс
ступені можна ўлазіць у даўгі, каб мець магчымасц
расплаціцца. Асабліва гэта датычыла многіх маладь
шляхціцаў, якія, атрымаўшы маёнткі па спадчыне, ад
чувалі сабе сапраўднымі багачамі і вялі адпаведн
лад жыцця. Хаця насамрэч іх маёмасць была пакры
та яшчэ бацькоўскімі даўгамі. Выхад з такой сітуацы
У.Гадон бачыў ва ўкараненні ў краі правілаў аб іпа
тэцы па прыкладу Прусіі. Г. зн. павінны былі весціс
спецыяльныя іпатэчныя кнігі, у якіх адлюстроўвала
ся б ацэнка закладзенай маёмасці і фіксаваліся ўс
даўгі, якія на ёй ляжалі[78].

Большасць з тых, хто пакінуў свае меркаванні ад
носна эксдывізарскіх судоў, выказваліся аб іх у нега
тыўным тоне. Прычым гэта датычыла як непасрэдна
дзейнасці гэтых судоў, так і ў цэлым дадзенага пра
вавога інстытута.

Значнай крытыцы падвяргалася праца суддзя
(эксдывізараў). Генерал Юзэф Ваўжэцкі (брат вя
домага палітычнага і вайсковага дзеяча Тамаш
Ваўжэцкага) называў эксдывізарскія суды *"справяд*
*ліва і ўсюды ненавіснымі"*. Адну з галоўных прычы
гэтага ён бачыў у прадузятасці суддзяў, якая, у свак
чаргу, была вынікам прызначэння іх па прынцыпа
сваяцкіх сувязяў, сяброўства і г. д.[79]. Як ужо гаварыла
ся, падчас судовага працэсу члены суда жылі ў маён
тку, які дзялілі, і ўтрымліваліся за яго кошт. Яны маг
прывозіць сюды сваіх жонак, дзяцей, псярню, коне
і слуг, бавіць час паляваннем, гульнёй у карты, свец
кімі прыёмамі з выпіўкай і танцамі. Мяркуючы па тым
што гэта апісваецца ў розных крыніцах, такія выпад
былі дастаткова распаўсюджанымі[80]. У той жа час тэр
міны судовага працэсу не былі рэгламентаваныя. На
турально, гэта не дадавала суддзям жадання як маг
хутчэй вырашыць справу. Выдаткі на ўтрыманне с
да дадаткова абцяжарвалі гаспадарку і часам пры
водзілі да яе канчатковага заняпаду. А суддзі пасл
заканчэння судовага працэсу яшчэ бралі з крэдыт
раў вялікі ганарар і, як пісаў С.Мараўскі, *"з багата*
*здабычай, як татары, як запарожцы да сечы сваё*
*вярталіся"* да дому, а суцяжнікаў пакідалі ні з чым[81].
прыклад такой сітуацыі ён прыводзіў падзел маёнтк
сям'і Пянчкоўскіх Езна (у Троцкім павеце Віленска
губерні)[82]. З даволі рэзкай крытыкай эксдывізарск
судоў выступала таксама віленская газета "Вулічн

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

("Wiadomości Brukowe") — друкаваны орган таварыства шубраўцаў, якое аб'ядноўвала мясцовую шляхецка-ліберальную грамадскасць. У шэрагу артыкулаў сатырычнага характару эксдывізарскія суды абвінавачваліся ў прадузятасці, злоўжываннях і хабарніцтве[83].

Акрамя выпадкаў нядобрасумленнасці членаў суда, г.зн. чалавечага фактару, прычынай крытыкі эксдывізарскіх судоў былі непасрэдна самі нормы судаводства. Так, "радавой хваробай" эксдывізарскіх судоў была фактычна немагчымасць справядлівага падзелу ўладанняў даўжніка без нанясення шкоды гаспадарцы. У любым маёнтку былі землі рознага гатунку адносна іх ўрадлівасці, а таксама ўвогуле лясы, лес ці балоты. Размеркаваць іх раўнамерна паміж крэдыторамі і пры гэтым пазбегнуць цераспалосіцы было задачай практычна невырашальнай. Акрамя таго, варта мець на ўвазе, што падзелу падлягалі не толькі ўгоддзі і будынкі, але і сяляне. А яны таксама маглі быць розных катэгорый. Напрыклад, цяглыя і чыншавікі[84]. Дадзеная праблема ўзмацнялася тым, што для суддзяў адсутнічалі вызначаныя крытэрыі ацэнкі кошту ўладанняў. Таму таксацыя не магла не насіць суб'ектыўнага характару[85]. А значыць, непазбежнымі станавіліся прэтэнзіі да аб'ектыўнасці і бесстароннасці суда. Як вынік — бясконцыя апеляцыі, якія зацягвалі справы на доўгія гады. Прывядзем наступны прыклад. Нейкая жанчына па імені Аграфена Рэпіна ў 1820 г. па рашэнні эксдывізарскага суда атрымала частку маёмасці яе даўжнікоў братоў Івана і Франца Беліковічаў. Доўг перайшоў ім па спадчыне ад іх бацькі Антона Беліковіча. Аграфене Рэпінай дастаўся засценак Гурба (у Барысаўскім павеце) памерам 7 валок 6 моргаў, ацэнены судом у 783,49 серабранага рубля. Аднак Аграфена засталася гэтым рашэннем незадаволеная і звярнулася ў Мінскі галоўны суд з апеляцыяй. Па яе словах, засценак знаходзіўся ў балоцістай мясцовасці і да яго было цяжка дабрацца. А вясной і восенню ўвогуле немагчыма. Больш за тое, частку самога зямельнага надзелу займала балота. Рэпіна паспрабавала прадаць гэтую маёмасць, аднак за такую цану, якую вызначыў эксдывізарскі суд, пакупнікоў не знайшлося. Аграфена прасіла Мінскі галоўны суд прызначыць продаж засценка з таргоў, а розніцу паміж доўгам і выручанай сумай дадаткова спагнаць з Беліковічаў. Прычым яна падкрэслівала: *"Если же при продаже оной не выручится* (сумы доўгу. — **І.Г.**) *... в таком случае очевидность то, что эксдивизорский суд сделал для меня большую несправедливость"*[86].

Прастор для злоўжыванняў з боку даўжнікоў давала правіла, згодна з якім пры эксдывізіі недатыкальнай заставалася доля ў маёнтку жонкі даўжніка ў памеры яе пасагу. Некаторыя даўжнікі гэтым карысталіся, загадзя рыхтуючы дакументы, якія на судзе дазвалялі паказаць частку маёмасці як пасаг жонкі і такім чынам пакінуць за сабой[87]. Падобны прыклад у сваіх успамінах прыводзіў С.Мараўскі. Па яго словах, другая жонка Міхала Клеафаса Агінскага Марыя


2 Skutkiem Dekretu Remissyynego Sądu Gł. Mińskiego 2go Departamentu w roku teraznieyszym 1819 7bra 29 dnia ferowanego, rozdział majątku Parafianowa i Krzywicz w powiecie Wileyskim sytuowanych oraz dalszych wszelkich funduszow JW. Jana Chodzki b. Prezydenta Sądu Gł. Minskiego i orderow kawalera determinującego, Sąd dzielczy w komplecie z trzech osob złożony ad fundum tegoż majątku na dniu 20 9bra teraz idącego roku zebrawszy się, po zapisaniu Reasumpcyi i po załatwieniu między stronami wszystkich akcessorytnych sprzeczek i komportacyą Dokumentow dla wyświetlenia massy funduszu oraz ciężarow tak na debitorze, jako też na wszystkich jego kredytorach i pretensorach do kancellaryi Ziemskiey Wileyskiey od dnia 20 9bra teraźnieyszego roku z dwuniedzielną persystencyą przeznaczył, odkład summy pojezuickiey, tudzież z dopominku Barona Asza wynikłey a na dobrach Parafianowie oparte, stosownie do remissy wszystkim bez wyłączenia kredytorom w powiernym zjeździe nakazawszy, termin onego zjazdu na dzień 29. Xbra teraźnieyszego 1819 roku do dobr Parafianowa pod utratą dopominkow przeznaczył; o jakowym terminie aby nikt z kredytorow niewiadomością składać się niemogł, przez ninieyszą zawiadamia się awizacyą. 1819 roku mca 9bra 25 dnia.
Stanisław Swiętorzecki Prezydu Exdywizor.
Józefat Iwanowski Pisarz Ziem. Pttu Min. Exdywizor.
Ignacy Kozieł Pisarz Pttu Bor. Exdywizor.
Atanazy Rund Regent Exdywizor.

*Абвестка аб эксдывізіі маёнтка Я.Ходзькі ў газеце "Kuryer Litewskir".* 1819 г.

Нагурская (дэ Нэры) нейкім чынам здолела ператварыць 400 тыс. злотых свайго сапраўднага пасагу ў 4 мільёны па дакументах. Такім манеўрам яна ў выніку эксдывізіі па даўгах мужа захавала значную частку яго маёмасці, у тым ліку знакаміты маёнтак Залессе ў Ашмянскім павеце[88], які называлі "Паўночнымі Афінамі". А крэдыторы Агінскага засталіся, зразумела, практычна ні з чым. Яшчэ адной прававой "шчылінай", якой карысталіся даўжнікі, была выдача распісак на неіснуючыя пазыкі. Такім чынам, праз падстаўных асоб яны маглі фактычна стаць у шэраг крэдытораў і захаваць па выніках эксдывізіі кантроль над часткай маёмасці[89].

У сваю чаргу, крэдыторы таксама маглі выкарыстоўваць некаторыя юрыдычныя хітрыкі, каб атрымаць найбольш выгаднае для сябе рашэнне эксдывізарскага суда. Як ужо гаварылася, пры ранжыраванні даўгоў на больш ці менш прыярытэтныя перавага аддавалася пазыкам пад залог маёмасці (паводле так званага застаўнога права). Таму некаторыя крэды-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

торы, адчуўшы небяспеку за свой капітал і рэальную перспектыву эксдывізіі маёмасці даўжніка, схілялі таго да афармлення закладных запісаў, часам прыплачваючы за гэта наяўнымі грашыма. Адпаведна, астатнія крэдыторы, нават з больш даўнімі запісамі, маглі па выніках працэсу застацца ні з чым[90]. С.Мараўскі ў сваіх успамінах згадваў, што былі прыклады, калі за 100 тысяч пазычаных злотых ў выніку шматгадовага эксдывізарскага працэсу крэдыторы атрымлівалі толькі ліхтар ці зламанае дышла ад карэты[91].

Эксдывізіі негатыўным чынам адбіваліся на развіцці гаспадарак, якія падвяргаліся падзелам. У перыяд судовага працэсу яны знаходзіліся ў часовым кіраванні так званых адміністратараў. Ва ўмовах чакання далейшага лёсу маёнтка тыя, натуральна, не былі зацікаўленыя ва ўкладанні сродкаў у развіццё гаспадаркі. Так, Ф.Пашкевіч у сваім артыкуле у "Віленскім дзённіку" за 1815 г. адзначаў, што звычайна адбывалася спусташэнне глебы, бо яе не ўгнойвалі[92]. Вялікіх выдаткаў патрабавала ўтрыманне суда — суддзяў, канцылярыі, а таксама адвакатаў і іх памагатых. Важнае і часцей за ўсё негатыўнае значэнне мела драбленне ў выніку эксдывізарскіх судоў памешчыцкіх маёнткаў на часткі, бо гэта парушала іх гаспадарчую цэласнасць. У дадзеным кантэксце Ф.Пашкевіч параўноўваў эксдывізарскі суд з *"вулканічным землятрусам"*[93].

З улікам усіх паказаных праблем эксдывізарскіх судоў мелі месца прапановы іх скасаваць, замяніўшы продажам маёмасці даўжніка з таргоў[94]. На гэтым аспекце грамадзянскага судаводства ў 1830-х гг. канцэнтравалі ўвагу і прыхільнікі распаўсюджання на Заходні край расійскіх законаў[95], у прыватнасці кіеўскі генерал-губернатар Дзмітрый Бібікаў[96]. Аднак да моманту канчатковага замацавання тут расійскага заканадаўства, што адбылося ў 1840 г., канкрэтных мер па змяненні парадку спагнання даўгоў адной асобы на карысць некалькіх крэдытораў урад так і не прыняў. Адзначым, што захаванне эксдывізарскіх судоў прадугледжваў і праект ужо згаданага звода мясцовых законаў заходніх губерняў[97]. Гэта было звязана з тым, што землеўласнікі асцерагаліся, у выпадку банкруцтва, распродажу сваёй маёмасці за бясцэнак. У гэтым сэнсе эксдывізія ім бачылася больш гуманным для даўжніка спосабам спагнання доўгу, чым продаж з публічных таргоў. Такую думку ў дакладзе Сенату выказваў у 1816 г. прэзідэнт грамадзянскага дэпартамента Мінскага галоўнага суда Я.Ходзька[98]. Дарэчы, маёмасць самога Я.Ходзькі (маёнтак Парафьянава ў Вілейскім павеце) у 1819 г. падверглася эксдывізіі[99].

Трэба адзначыць, што былі і тыя, хто пазітыўна ацэньваў эксдывізарскія суды як спосаб вырашэння спрэчак аб нявыплачаных даўгах. У падобным ключы выказваўся грамадскі дзеяч краю 1830—1860-х гг. Генрык Жавускі, вядомы сваімі кансерватыўнымі поглядамі. Ён лічыў эксдывізарскія суды дастаткова эфектыўнымі, а праблемы, звязаныя з іх дзейнасцю, — вынікам выключна чалавечага чынніка, а не недасканаласці прававой традыцыі[100]. Праўда, пісаў ё[…] аб гэтым ужо ў 1850-я гг., калі самі эксдывізарскія су[…] ды ўжо не дзейнічалі, а прававыя традыцыі часоў ВК[…] і Рэчы Паспалітай сталі своеасаблівым сімвалам бы[…] лой велічы краю і дабрабыту шляхты.

На тэрыторыі Беларусі эксдывізарскія суды бы[…] лі скасаваныя ў 1840 г., а іх функцыі перададзены[…] конкурсным упраўленням неплацежаздольных даўж[…] нікоў[101]. Адпаведна, спыняла дзеянне само эксдыві[…] зарскае права, замест якога ўкаранялася практыка[…] продажу маёмасці неплацежаздольных даўжнікоў з[…] публічных таргоў, а ўжо затым — падзелу выручаны[…] сродкаў паміж крэдыторамі.

Эксдывізарскія суды як форма эканамічнага пра[…] васуддзя з'яўляліся адметнай рысай мясцовай пра[…] вавой традыцыі. Велізарная колькасць эксдывізарскі[…] судовых спраў у першай трэці XIX ст. яскрава свед[…] чыла аб крызісных з'явах у эканоміцы так званых за[…] ходніх губерняў. Для сучаснікаў эксдывізіі былі свое[…] асаблівым сімвалам заняпаду краю. Прычым не толь[…] кі эканамічнага, але таксама прававога і маральнага[…] Самі па сабе эксдывізарскія судовыя працэсы, што[…] нярэдка цягнуліся некалькі гадоў, негатыўным чынам[…] адбіваліся на гаспадарках, якія станавіліся аб'ектам[…] падзелу. Гэта праяўлялася ў вялікіх выдатках на ўтры[…] манне суда, немэтазгоднасці капіталаўкладанняў у і[…] развіццё ва ўмовах нявызначанасці далейшага лёсу[…] драбленні маёнткаў і г. д. Аднак, нягледзячы на да[…] волі вострую крытыку, эксдывізарскія суды ў заходні[…] губернях дзейнічалі, пакуль у 1840 г. імперскія ўлад[…] канчаткова не замянілі тут мясцовыя прававыя нор[…] мы расійскімі законамі.

---

1 Свод местных законов западных губерний. Про[…] ект. Санкт-Петербург, 1910. С. 354—370.

2 Korowicki A. Proces cywilny litewski. Wilno, 182[…] S. 217—256.

3 Chodźka J. O exdywizyach chyli o podziale sądowy[…] majątku dłużnika dla wierzycielów // Dziennik Wileńs[…] (далей — DW). 1816. T. 4. № 21. S. 194—227; Gadon W[…] O exdywizjach, z powodu rozprawy pana Prezydent[…] Chodźki // DW. 1816. T. 4. № 24. S. 506—518; Domeyko[…] O exdywizyach // DW. 1817. T. 5. № 28. S. 334—378; Röme[…] M. Odpowiedź na list JW Wierzejskiego // DW. 1817. T. 5. N[…] 28. S. 378—386; Wawrzecki J. O zaradzeniu złym skutko[…] exdywizyy // DW. 1817. T. 5. № 25. S. 54—59; Wierzeys[…] A. O exdywizyach, list do pana prezydenta Chodźki // DW[…] 1817. T. 5. № 27. S. 220—229; Widomo nazywające s[…] exdywizya // DW. 1817. T. 6. № 32. S. 178—191.

4 Войшвилло Е.М. Эксдивизорские суды и их компе[…] тенция в губерниях бывшего Великого княжества Лито[…] ского в конце XVIII и первой половине XIX в. Вильна, 189[…]

5 Рубинштейн С.Ф. Виленский эксдивизорский до[…] (историко-юридическая справка). Вильна, 1892.

6 Бравер Е.Л. К вопросу об истории судебных у[…] реждений Белоруссии конца XVIII — первой половин[…] XIX в. // Вопросы архивоведения и источниковедени[…] в БССР. Минск, 1971. С. 469-470; Луговцова С.Л. Р[…] формирование системы судебных учреждений Бел[…] руси в последней трети XVIII в. // Працы гістарычна[…] факультэта БДУ. Вып. 4. Мінск, 2009. С. 293; Гушчы[…]

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

...Г., Жытко А.П., Талмачова С.А. Судовыя ўстановы ...раі (1775—1872 гг.) // Дзяржаўнае кіраванне і гра...ское самакіраванне на тэрыторыі Беларусі (канец ... — пачатак XX ст.). Мінск, 2017. С. 123.

Godek S. III Statut Litewski w dobie porozbiorowej. ...rszawa, 2012. S. 62, 259, 271 і інш.

Грузицкий Ю. Ипотечный кредит в Великом Кня...стве Литовском (XVII—XVIII вв.) // Банкаўскі веснік. ...14. № 9. С. 67-68.

Доўнар Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. ...нск, 2014. С. 163.

Рубинштейн С.Ф. Виленский эксдивизорский дом ...торическая справка). С. 9.

Статут Великого Княжества Литовского с подве...нием в надлежащих местах ссылки на конституции, ...личные содержанию оного. Санкт-Петербург, 1811. ...2. С. 17-18.

Volumina Legum. Petersburg, 1860. T. 7. S. 75.

Рубинштейн С.Ф. Виленский эксдивизорский дом ...торическая справка). С. 20-21.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — ...АБ). Ф. 146, воп. 2, спр. 2474, арк. 141—229.

Chodźka J. O exdywizyach chyli o podziale sądowym ...ątku dłużnika dla wierzycielów. S. 200.

Domeyko I. O exdywizyach. S. 338.

Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska pod ...ględem historycznym, geograficznym i statystycznym ...isana. T. III. Warszawa, 1846. S. 234.

Volumina Legum. T. 6. S. 235—237.

Там жа. Т. 7. S. 237.

Там жа. Т. 2. S. 257.

Там жа. Т. 7. S. 173.

Статут Великого Княжества Литовского… Ч. 1. ...466.

Там жа. С. 292—293.

Полное собрание законов Российской империи ...алей — ПСЗРИ). Собр. 1. Т. 37. 1820—1821. № 28276; ...бр. 2. Т. 2. 1827. № 1232, № 1396.

Там жа. Т. 40. 1825. № 30248.

Там жа. Т. 35. 1818. № 27318.

Korowicki A. Proces cywilny litewski. S. 217.

Словарь древнего актового языка Северо-За...дного края и Царства Польского. Вильна, 1874. ...364.

Korowicki A. Proces cywilny litewski. S. 218.

Там жа. S. 218-219.

Там жа. S. 219.

Volumina Legum. T. 7. S. 237.

Войшвилло Е.М. Эксдивизорские суды и их ком...петенция в губерниях бывшего Великого княжества Ли...товского в конце XVIII и первой половине XIX в. С. 12.

Korowicki A. Proces cywilny litewski. S. 220.

Там жа. S. 222; Chodźka J. O exdywizyach chyli o pod...ziale sądowym mająntku dłużnika dla wierzycielów. S. 215.

НГАБ. Ф. 588, воп. 1, спр. 251, арк. 53.

Podróż z miasta powiatowego do stolicy przez ...chcica po eksdywizji odbyta // Wiadomości Brukowe. ...dziernika. 1820. S. 160; НГАБ. Ф. 588, воп. 1, спр. ..., арк. 100.

Chodźka J. O exdywizyach chyli o podziale sądowym ...ątku dłużnika dla wierzycielów. S. 215; Domeyko I. O ...dywizyach. S. 347.

НГАБ. Ф. 146, воп. 2, спр. 84, арк. 52.

[40] Wierzeyski A. O exdywizyach, list do pana prezydenta Chodźki. S. 225.

[41] ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 44: Кн. штатов. К № 27887. С. 196.

[42] Kuryer Litewski. 17 maja 1819. S. 1-2.

[43] Volumina Legum. T. 6. S. 236.

[44] Свод местных законов западных губерний. С. 357.

[45] Войшвилло Е.М. Эксдивизорские суды и их компетенция в губерниях бывшего Великого княжества Литовского в конце XVIII и первой половине XIX в. С. 11.

[46] Там жа. С. 12.

[47] Korowicki A. Proces cywilny litewski. S. 222.

[48] Там жа. S. 223.

[49] Morawski S. Kilka lat młodości mojej w Wilnie (1818—1825). Warszawa, 1924. S. 194; Булгарин Ф.В. Полное собрание сочинений Фаддея Булгарина. Т. 1. Санкт-Петербург, 1839. С. 181.

[50] Войшвилло Е.М. Эксдивизорские суды и их компетенция в губерниях бывшего Великого княжества Литовского в конце XVIII и первой половине XIX в. С. 13.

[51] Там жа. С. 14.

[52] Там жа. С. 16.

[53] Chodźko I. Obrazy litewskie. T. II. Wilno, 1840. S. 9—49.

[54] Felińska E. Siestrzenica i ciotka. Wilno, 1853. S. 10—40.

[55] Яцкоўскі І. Аповесць з майго часу, альбо Літоўскія прыгоды. Warszawa, 2010. С. 205—208.

[56] Булгарин Ф.В. Полное собрание сочинений Фаддея Булгарина. Т. 1. С. 180-181.

[57] Chodźko I. Obrazy litewskie. T. II. S. 16—18.

[58] Там жа. S. 20—25.

[59] Там жа. S. 49

[60] Korowicki A. Proces cywilny litewski. S. 221-222, 235.

[61] Войшвилло Е.М. Эксдивизорские суды и их компетенция в губерниях бывшего Великого княжества Литовского в конце XVIII и первой половине XIX в. Вильна. С. 15.

[62] Статут Великого Княжества Литовского с подведением в надлежащих местах ссылки на конституции, приличные содержанию оного. Ч. 1. С. 467-468.

[63] Войшвилло Е.М. Эксдивизорские суды и их компетенция в губерниях бывшего Великого княжества Литовского в конце XVIII и первой половине XIX в. Вильна. С. 16.

[64] Рубинштейн С.Ф. Виленский эксдивизорский дом (историко-юридическая справка). С. 19.

[65] НГАБ. Ф. 588, воп. 1, спр. 260, арк. 440.

[66] Там жа. Ф. 146, воп. 3, спр. 12, арк. 20.

[67] ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 21. 1781—1783. № 15380; Т. 31. 1810. № 24187.

[68] Там жа. Т. 31. 1810. № 24187.

[69] Войшвилло Е.М. Эксдивизорские суды и их компетенция в губерниях бывшего Великого княжества Литовского в конце XVIII и первой половине XIX в. Вильна. С. 16.

[70] ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 37. 1820—1821. № 28376.

[71] Там жа. Т. 32. 1812—1814. № 25539.

[72] Morawski S. Kilka lat młodości mojej w Wilnie (1818—1825). S. 394.

[73] Gadon W. O exdywizjach, z powodu rozprawy pana Prezydenta Chodźki. S. 506.

[74] Smolka S. Polityka Lubeckiego przed powstaniem listopadowem. Kraków, 1907. T. 1. S. 371.

[75] Chodźka J. O exdywizyach chyli o podziale sądowym mająntku dłużnika dla wierzycielów. S. 194—227.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

[76] Там жа. S. 209; Domeyko I. O exdywizyach. S. 340—343; Gadon W. O exdywizjach, z powodu rozprawy pana Prezydenta Chodźki. S. 508-509.

[77] Chodźka J. O exdywizyach chyli o podziale sądowym majątku dłużnika dla wierzycielów. S. 209—211.

[78] Gadon W. O exdywizjach, z powodu rozprawy pana Prezydenta Chodźki. S. 508—509.

[79] Wawrzecki J. O zaradzeniu złym skutkom exdywizyy. S. 56.

[80] Wierzeyski A. O exdywizyach, list do pana prezydenta Chodźki. № 27. S. 225; Morawski S. Kilka lat młodości mojej w Wilnie (1818—1825). S. 194; Булгарин Ф.В. Полное собрание сочинений Фаддея Булгарина. Т. 1. С. 181; Felińska E. Siestrzenica i ciotka. S. 23.

[81] Morawski S. Kilka lat młodości mojej w Wilnie (1818—1825). S. 194.

[82] Там жа. S. 398.

[83] Podróż z miasta powiatowego do stolicy przez szlachcica po eksdywizji odbyta // Wiadomości Brukowe (далей — WB). 3 pazdziernika 1820. C. 159—161; Diabelstwo kulawe ("Eksdywizja") // WB. 4 maja 1818. C. 71-72; Artykuł ze wsi nadesłany // WB. 19 kwietnia 1819. C. 67-68.

[84] Domeyko I. O exdywizyach. S. 351.

[85] Там жа. S. 352-353.

[86] НГАБ. Ф. 1156, воп. 1, спр. 11, арк. 96—97.

[87] Chodźka J. O exdywizyach chyli o podziale sądowym majątku dłużnika dla wierzycielów. S. 212.

[88] Morawski S. Kilka lat młodości mojej w Wilnie (1818—1825). S. 87-88.

[89] Chodźka J. O exdywizyach chyli o podziale sądowym majątku dłużnika dla wierzycielów. S. 212.

[90] Там жа. S. 213.

[91] Morawski S. Kilka lat młodości mojej w Wilnie (1818—1825). S. 194.

[92] Paszkiewicz F. Co było dotychczas i co jest na przeszkodzie dźwignieniu się rolnictwa w Księstwi[e] Litewskim // DW. 1815. T. 2. № 9. S. 254.

[93] Там жа. S. 255.

[94] Domeyko I. O exdywizyach. S. 355; Paszkiewicz F. C[o] było dotychczas i co jest na przeszkodzie dźwignieniu si[ę] rolnictwa w Księstwie Litewskim. S. 255.

[95] О необходимости уничтожения отдельных прав [в] губерниях от Польши возвращенных и изменении не[до]статков, противных государственному благоустрой[ст]ву // Чтения в Императорском обществе истории [и] древностей российских при Московском университе[те]. 1866. Т. 1. С. 109.

[96] Нольде А.Э. Очерки по истории кодификаци[и] местных гражданских законов при графе Сперанском[.] Санкт-Петербург, 1906. С. 228.

[97] Свод местных законов западных губерний. С. 354—370.

[98] Chodźka J. O exdywizyach chyli o podziale sądowym majątku dłużnika dla wierzycielów. S. 217.

[99] НГАБ. Ф. 588, воп. 2, спр. 176, арк. 2.

[100] Rzewuski H. O dawnych i teraźniejszych prawach polskich słów kilka. Kraków, 1855. S. 81—90.

[101] ПСЗРИ. Собр. 2. Т. 15. 1840. Отд. 1. № 13342; № 13591.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ